УДК 004.9

У.І. Куліковіч, дац., канд. філал. навук;
А.Г. Барашка, дац., канд. тэхн. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ЯК ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ: МЭТА, ВІДЫ, ПРЫЗНАЧЭННЕ

Слова **прэзентацыя** паходзіць ад лацінскага слова «praesento» – перадаю, уручаю, або англійскага «to present», што ў перакладзе азначае паказаць што-небудзь. У большасці слоўнікаў беларускай мовы даецца толькі такое тлумачэнне тэрміна *прэзентацыя*: «Падача, прадстаўленне для аплаты грашовага дакумента. *Прэзентацыя вэксаля*» [1, с. 256]. І гэта пры тым, што слова адносіцца сёння да найбольш ужывальных іншамоўных слоў беларускай мовы.

У Нацыянальным корпусе беларускай мовы выяўлены наступныя словазлучэнні з назоўнікам прэзентацыя, якія дэманструюць значна шырэйшы семантычны аб’ем тэрміна.

Амерыканскі слоўнік маркетынгавых тэрмінаў дае такое вызначэнне: «**Прэзентацыя** – выступ, які часам суправаджаецца візуальнымі вобразамі, накіраваны на тое, каб данесці да аўдыторыі інфармацыю і/або пераканаць яе ажыццявіць пэўныя дзеянні, патрэбныя арганізатару прэзентацыі». У адрозненне ад рэкламы такое выступленне прадугледжвае зацікаўленасць аўдыторыі ў атрыманні інфармацыі. З гэтага вынікае, што прэзентацыя ёсць паведамленне і перадача слухачам (гледачам) новых ідэй, распрацовак, планаў. Іншымі словамі: **ПРЭЗЕНТАЦЫЯ** – 1) выступ, публічнае прадстаўленне чаго-небудзь ці каго-небудзь зацікаўленай аўдыторыі; 2) дакумент або камплект дакументаў, прызначаны для паказу (прадстаўлення) чаго-небудзь (*арганізацыі, праекта, прадукту*), які можа з’яўляцца адным з маркетынгавых і PR інструментаў; 3) інфармацыйная тэхналогія для таго, каб забяспечыць спажыўцоў інфармацыяй, патрэбнай менавіта гэтай групе людзей і накіраванай на тое, каб выклікаць пэўныя сацыяльныя паводзіны і пэўную рэакцыю.

**Табліца**

| Словазлучэнні са словам прэзентацыя | Значэнне слова “прэзентацыя” |
|---|---|
| 1 | 2 |
| **Прэзентацыя кнігі** (кніжнай серыі, альбома, кліпа, песні, праекта, сайта, альманаха, калекцыі, праграмы; жаніха каманды, кампаніі, краіны) | *фармальнае прадстаўленне чаго-небудзь або каго-небудзь для грамадскасці.* |

Працяг табліцы

| 1 | 2 |
|---|---|
| **Камп'ютарная прэзентацыя** | *электронны дакумент, пададзены ў выглядзе набору старонак (слайдаў), аб'яднаных агульнай тэмай. На слайдах могуць размяшчацца тэкст, табліцы, графічныя аб'екты.* |
| **Прэзентацыя новых дадзеных** | *адлюстраванне, прадстаўленне чыйго-небудзь погляду або думкі.* |
| **Прэзентацыя выклікала хваляванне** | *дзейнасць па фармальным прадстаўленні (паказе) чаго-небудзь* |

У рэдакцыйным, офісным, адукацыйным кантэксце слова *прэзентацыя* – сінонім *слайд-прэзентацыі, слайд-шоу*. Усе сучасныя офісныя работнікі, студэнты, школьнікі адназначна разумеюць выразы «падрыхтаваць прэзентацыю» і «скінуць прэзентацыю»: гаворка ідзе пра файлы створаныя з дапамогай праграмы Microsoft Power Point ці іншай аналагічнай праграмы.

Такі фармат падачы інфармацыі выкарыстоўваецца часта пры чытанні лекцый, дакладаў, падчас выступаў на навуковых канферэнцыях. Устаноўлена, што дэманстрацыя малюнкаў, зразумелыя і пераканаўчыя загалоўкі, наглядныя лічбы, відэаролікі, якія дазваляюць мозгу адпачыць, – усё гэта больш цікава замест сухой прамовы, якая звычайна дрэнна ўспрымаецца слухачамі.

Прынята лічыць: шырокае выкарыстанне прэзентацый, г. зн. паказ слайдаў у вучэбным працэсе, падчас перагавораў, прыйшло да нас пад уплывам «амерыканскіх прынцыпаў карпаратыўных зносін», бо менавіта «амерыканцам арганічна ўласціва думаць вачамі», у той час як у еўрапейцаў «ніколі не лічылася сорамам паказацца на публіцы з аповедам без намаляваных тэзісаў» [2].

**Мэта** любой прэзентацыі – данесці да аўдыторыі поўнавартасную інфармацыю пра аб'ект ці прадмет паведамлення (паказу) у зручнай форме. Яе асноўныя перавагі перад публічным выступленнем без слайдаў дзве: 1) магчымасць хутка і эфектыўна распаўсюдзіць вялікія аб'ёмы інфармацыі; 2) складаную навуковую інфармацыю прадставіць наглядна, жыва, з дапамогай візуальных сродкаў і тым самым аблегчыць яе ўспрыманне.

Вылучаюць тры асноўныя задачы правядзення прэзентацыі: *праінфармаваць*; *пераканаць*; *заахвоціць да пазітыўнага дзеяння*. Адпаведна прэзентацыі могуць быць трох тыпаў – *інфармацыйнымі*, *пераконваючымі*, *аналітычнымі*.

У залежнасці ад месца выкарыстання вылучаюць наступныя віды прэзентацый: створаныя для падтрымкі якога-небудзь

мерапрыемства, падзеі; створаныя для відэадэманстрацыі (разнавіднасць – рэкламны ролік); створаныя для электроннай рэкламнай рассылкі; створаныя ў фармаце дадатку да мабільных тэлефонаў і смартфонаў; створаныя для правядзення заняткаў (вучэбныя прэзентацыі).

Галоўнае прызначэнне прэзентацыі – візуальнае дапаўненне вуснага маўлення навуковага даклада (лекцыі), якое робіць лягчэйшым успрыняцце і разуменне матэрыялу за кошт адначасовага выкарыстання двух розных каналаў атрымання інфармацыі: зрокавага і слыхавога. Візуалізацыя ў падрыхтоўцы будучых рэдактараў дазваляе рашыць шэраг і педагагічных, і прафесійных задач. Па-першае, яна забяспечвае інтэнсіфікацыю навучання, што ўплывае на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў пры змяншэнні колькасці гадзін на вывучэнне адпаведнай дысцыпліны. Па-другое, актывізуе вучэбную і пазнавальную дзейнасць. Па-трэцяе, спрыяе фарміраванню і развіццю крытычнага і візуальнага мыслення, зрокавага ўспрымання, вобразнага прадстаўлення ведаў і навучальных дзеянняў. Па-чацвёртае, дазваляе павысіць візуальную пісьменнасць і візуальную культуру.

Мэтазгодна выкарыстоўваць найбольш распаўсюджаныя метады візуалізацыі, якія выкарыстоўваюцца ў агульнаадукацыйных устано–вах: *таймлайн*, *воблака слоў*, *кластар*.

**Таймлайн** (англ. «timeline» – лінія часу) – гэта шкала часу, прамы адрэзак, на які ў храналагічнай паслядоўнасці наносяцца падзеі. Яна спрыяе фарміраванню ў навучэнцаў сістэмнага погляду на пэўныя гістарычныя працэсы. Гэты метад можна выкарыстоўваць не толькі для вывучэння дат, фактаў і падзей, але і для працы з любым навучальным матэрыялам, які прадугледжвае ўсталяванне паслядоўнасці.

**Воблака слоў** (англ. tag cloud, Word cloud, wordle) – візуальнае прадстаўленне спісу рэдакцыйна-выдавецкіх катэгорый ключавымі словамі рознага памеру, шрыфту, колеру. Спосабы выкарыстання могуць быць рознымі: для стварэння розных відаў і жанраў літаратуры, для вывучэння адметнасцей тэксту і г. д. Метад спрыяе фарміраванню крэатыўнасці, супрацоўніцтва, камунікацыі і крытычнага мыслення.

**Кластар** (вялікая колькасць, гронка, пучок) – гэта графічная форма арганізацыі інфармацыі, калі вылучаюцца асноўныя сэнсавыя адзінкі, якія фіксуюцца ў выглядзе схемы з пазначэннем усіх сувязяў паміж імі. Як правіла, гэта малюнак, які спрыяе сістэматызацыі і абагульненню вучэбнага матэрыялу. Сутнасць прыёму заключаецца ва

ўменні студэнтаў працаваць з тэкстам і іншымі крыніцамі інфармацыі, вызначаць тэму і рэму, цэласнасць і звязнасць тэксту, знаходзіць ключавыя словы і інш. Вартасці кластара наступныя. З яго дапамогай можна ахапіць вялікі аб'ём інфармацыі; уключыць усіх удзельнікаў у навучальны працэс; сфарміраваць і развіць уменне ставіць пытанні, вылучаць галоўнае, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі і фармуляваць вывады; пераходзіць ад прыватнага да агульнага, разумеючы праблему ў цэлым; параўноўваць і аналізаваць.

Магчыма выкарыстоўваць наступныя віды кластараў: планета і яе спадарожнікі, гронка, блок-схема, фішбоўн.

**«Планета і яе спадарожнікі»** – у цэнтры-ключавое слова (тэма). Гэта своеасаблівая "планета". Вакол – буйныя сэнсавыя адзінкі ("Спадарожнікі"). **«Гронка»** – выгляд падобны да папярэдняга. Таксама вылучаюцца тэмы і падтэмы. Запісваюцца, звязваюцца стрэлкамі. У кожнай падтэме – свае адгалінаванні. **«Блок-схема» –** выкарыстоўваецца для складання алгарытму выканання якога-н. дзеяння. Тут кожны элемент – гэта крок (этап, дзеянне), размешчаныя ў пэўнай паслядоўнасці. «**Фішбоўн»** – «рыбін шкілет». Галава – пытанне тэмы, верхнія косткі – асноўныя паняцці тэмы, ніжнія косткі – сутнасць паняццяў, хвост – адказ на пытанне.

Прэзентацыя можа быць падрыхтавана і без камп'ютара. Адна з разнавіднасцей – прэзентацыя на вялікіх лістах. Пры яе стварэнні выкарыстоўваюцца самыя розныя інструменты, маркеры рознага колеру, стыкеры розных памераў і колеру, паштоўкі, калажы і інш.

Такім чынам, для рэдактара, задача якога «прыводзіць у парадак інфармацыю», важна ўсвядоміць тры асноўныя значэнні тэрміна прэзентацыя. 1. Прэзентацыя (грамадскі паказ, падача) – грамадскае прадстаўленне, паказ чаго-небудзь новага, што нядаўна з'явілася, было створана. 2. Прэзентацыя (спосаб прадстаўлення інфармацыі) – інфармацыйны або рэкламны інструмент, які дазваляе паведаміць патрэбную інфармацыю аб аб'екце прэзентацыі ў зручнай для атрымальніка форме. 3. Мультымедыя – набор слайдаў і спецэфектаў (слайд-шоу), тэкставае змесціва прэзентацыі, нататкі дакладчыка, а таксама раздатачны матэрыял для аўдыторыі, якія захоўваюцца ў адным файле.

## ЛІТАРАТУРА

1. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў. У 2 т. Т. 2: М–Я. Мінск: БелЭн, 1999. 736 с.

2. Лебедев, А. Бессмысленная презентация [Электронный ресурс]. URL: www.artlebedev.ru/kovodstvo/sections (дата обращения: 25.01.2023).